ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!


ПЯТНІЦА, 27 МАЯ 1938 г. № 29 (371)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР











НАРОДНАЕ ЛІКАВАННЕ

Лікуе Савецкая Беларусь. Лікуе свабодны беларускі народ. Над прасторамі яго зямлі, нібы яснакрылы птах, абляцела жаданая вестка: таварыш Сталін і яго баявыя саратнікі, члены Палітбюро ЦК ВКП(б) таварышы Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Ежоў, Жданаў далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

Яны з намі. Яны былі з намі ў самыя цяжкія для рэспублікі годы, калі маладая Савецкая Беларусь задыхалася ў агні грамадзянскай вайны, адбівала лютыя паходы імперыялісцкіх дзяржаў.

Таварыш Сталін арганізаваў адпор нямецкім інтэрвентам і белапольскім панам, якія чорнай навалай лезлі на Савецкую Беларусь. Іосіфу Вісарыёнавічу дапамагалі яго верныя вучні, адданыя сыны большэвіцкай партыі і народа—таварышы Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Ежоў, Жданаў.

Беларускі народ пад кіраўніцтвам слаўнай партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага генія рэвалюцыі таварыша Сталіна, пры актыўнай дапамозе гераічнага рускага пралетарыята назаўсёды прагнаў з беларускай зямлі нямецкіх імперыялістаў і белапольскую шляхту, змёўшы жалезнай мятлой іх след з нашых загонаў.

Таварыш Сталін, партыя Леніна — Сталіна арганізавалі соцыялістычнае будаўніцтва нашай рэспублікі, забяспечылі уздым народнай гаспадаркі, рост эканомікі, росквіт культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. Разам з Іосіфам Вісарыёнавічам нам штодзённа дапамагалі ў будаўніцтве соцыялізма загартаваныя сыны большэвіцкай партыі, любімыя сыны народа, таварышы Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Ежоў, Жданаў.

Пад кіраўніцтвам ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна наша рэспубліка з адсталай, разбуранай, поўкаланіяльнай ператварылася ў магутную індустрыяльна-аграрную дзяржаву з першакласнай тэхнікай. Выраслі фабрыкі, заводы, соцыялістычныя гарады, калгасы і соўгасы. Расцвіла беларуская соцыялістычная культура, навука, мастацтва і літаратура.

Таварыш Сталін арганізаваў разгром ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, агентаў япона-германскага і польскага фашызма, буржуазных нацыяналістаў, якія ў звярынай нянавісці хацелі распрадаць фашыстам нашу зямлю, заваяваную крывёю народа, рыхтавалі нам новую крывавую бойню.

Разам з Іосіфам Вісарыёнавічам бязлітасна выкрывалі і выкарчоўвалі ворагаў народа слаўныя большэвікі, ленінцы-сталінцы Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Ежоў, Жданаў.

Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, слаўная савецкая разведка на чале з таварышом Ежовым, пры актыўнай дапамозе усяго беларускага народа разграміла усіх ворагаў і канчаткова знішчае іх рэшткі. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, пры непасрэдным удзеле Клімента Ефрэмавіча Варашылава вырасла і загартавалася наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, якая надзейна ахоўвае заходнія рубяжы Савецкага Саюза.

Беларускі народ ніколі не забудзе сталінскай дапамогі, якая яму была аказана ў жніўні мінулага года.

Імя Сталіна лунае як сцяг праўды, барацьбы і перамог. Сталіну беларускі народ, як і ўсе народы Савецкага Саюза, аддае свае лепшыя думы і пачуцці, складае свае лепшыя песні.

Народ у адзіным парыве, у адзіным імкненні вылучыў кандыдатуры таварыша Сталіна і яго баявых саратнікаў у народны парламент нашай рэспублікі. І няма ні меж, ні граніц радасці, калі народ даведаўся аб згодзе таварышоў Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Ежова, Жданава балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР! І няма канца народнаму лікаванню.

Лікуе Савецкая Беларусь. У гарадах, на заводах і фабрыках, у вёсках і сёлах народ выйшаў на дэманстрацыі і мітынгі, каб выразіць сваю любоў да комуністычнай партыі, да свайго савецкага ўрада і таварыша Сталіна. Гэтыя дні сталі усенародным святам. Яны засведчылі, што савецкі выбарчы закон—дзецішча вялікай Сталінскай Канстытуцыі—самы дэмакратычны выбарчы закон ў свеце, заснаваны на пачатках свабоды, праўды і роўнапраўя.

Лікуе Савецкая Беларусь. Народ у адзін голас заяўляе: у адказ на аказанае нам давер'е ўсе свае галасы аддадзім мудраму правадыру, настаўніку і другу Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну і яго лепшым вучням; усе свае галасы аддадзім за кандыдатаў магутнага сталінскага блока партыйных і непартыйных большэвікоў. Беларускі народ аднадушна вылучае кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета рэспублікі сваіх лепшых сыноў і дачок, герояў і гераінь, якія ўмеюць адстаяць інтарэсы народа, соцыялістычнай айчыны, якія ўмеюць выкарчоўваць і знішчаць да кораня ворагаў народа, тройчы зненавідзеных звяроў фашызма—трацкісцка-бухарынскіх вырадкаў і буржуазных нацыяналістаў. Народ Савецкай Беларусі абяцае сталінскаму ЦК, савецкаму ўраду і таварышу Сталіну яшчэ больш мацаваць магутнасць Чырвонай Арміі, верна ахоўваць рубяжы Савецкай Беларусі—магутнага фарпоста Савецкага Саюза на граніцы з капіталістычным Захадам.

Работнікі літаратуры і мастацтва Савецкай Беларусі, як і ўвесь народ, сустрэлі паведамленне аб згодзе таварыша Сталіна і членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР з хвалюючай радасцю і ўздымам. Яны адгукнуліся на гэту падзею сваімі творамі.

Лікуе Савецкая Беларусь! Лікуе беларускі народ, сустракаючы свае выбары. Майстры слова! Майстры кісці! Майстры сцэны! Ярчэй адлюструем гэту дату ў сваіх лепшых працах, аддадзім сваё майстэрства справе партыі Леніна — Сталіна — комунізму.

Таварышы І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, Н. І. ЕЖОЎ далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР

Акруговы перадвыбарчы сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, служачых, студэнтаў, навуковых работнікаў, чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў Прамысловай выбарчай акругі № 166 горада Менска ў колькасці 8.000 выбаршчыкаў, выказваючы волю і жаданне ўсіх выбаршчыкаў, 19 мая аднадушна намеціў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР правадыра народаў таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча **Сталіна.**

Акруговы перадвыбарчы сход звярнуўся да Іосіфа Вісарыёнавіча **Сталіна** з просьбаю даць згоду балатыравацца па гэтай выбарчай акрузе ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

23 мая выбаршчыкі атрымалі паведамленне аб тым, што таварыш Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін** даў згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Прамысловай выбарчай акрузе горада Менска.

Выбаршчыкі Дзяржынскай выбарчай акругі № 168 горада Менска на перадвыбарчым сходзе 19 мая ў колькасці 7.000 чалавек звярнуліся да таварыша Вячаслава Міхайлавіча **Молатава** з просьбаю даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Дзяржынскай выбарчай акрузе горада Менска.

23 мая выбаршчыкі Дзяржынскай выбарчай акругі горада Менска атрымалі згоду Старшыні Савета Народных Камісараў Саюза ССР таварыша Вячаслава Міхайлавіча **Молатава** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Дзяржынскай выбарчай акрузе горада Менска.

Выбаршчыкі Молатаўскай выбарчай акругі № 161 горада Менска на сваім перадвыбарчым сходзе ў колькасці 10.000 чалавек 19 мая звярнуліся да Народнага Камісара абароны Саюза ССР, маршала Савецкага Саюза, дэпутата Вярхоўнага Савета СССР ад Менскай выбарчай акругі Клімента Ефрэмавіча **Варашылава** з просьбаю даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Молатаўскай выбарчай акрузе горада Менска.

23 мая выбаршчыкі Молатаўскай выбарчай акругі горада Менска атрымалі згоду таварыша Клімента Ефрэмавіча **Варашылава** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Молатаўскай выбарчай акрузе.

Выбаршчыкі Ленінскай выбарчай акругі № 48 горада Віцебска — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», шчаціна-шчотачнага камбіната імя Куйбышэва, студэнты і выкладчыкі Ветзаінстытута — на сваіх перадвыбарчых сходах звярнуліся да Народнага Камісара ўнутраных спраў і воднага транспарту СССР, Генеральнага Камісара дзяржаўнай бяспекі Нікалая Іванавіча **Ежова** з просьбаю даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе горада Віцебска.

23 мая выбаршчыкі Ленінскай выбарчай акругі № 48 горада Віцебска атрымалі згоду таварыша Нікалая Іванавіча Ежова балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе горада Віцебска.

Па атрыманні паведамлення таварышоў **І. В. Сталіна, В. М. Молатава, К. Е. Варашылава, Н. І. Ежова** адбыліся пасяджэнні акруговых выбарчых камісій.

Акруговая выбарчая камісія Прамысловай выбарчай акругі № 166 горада Менска зарэгістравала кандыдатуру таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча **Сталіна.**

Акруговая выбарчая камісія Дзяржынскай выбарчай акругі № 168 горада Менска зарэгістравала кандыдатуру таварыша Вячаслава Міхайлавіча **Молатава.**

Акруговая выбарчая камісія Молатаўскай выбарчай акругі № 161 г. Менска зарэгістравала кандыдатуру таварыша Клімента Ефрэмавіча **Варашылава.**

Акруговая выбарчая камісія Ленінскай выбарчай акругі № 48 горада Віцебска зарэгістравала кандыдатуру таварыша Нікалая Іванавіча **Ежова.**

Таварышы Л. М. КАГАНОВІЧ, М. І. КАЛІНІН, А. І. МІКАЯН, А. А. АНДРЭЕЎ, А. А. ЖДАНАЎ далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Выбаршчыкі Сталінскай выбарчай акругі № 260 горада Гомеля — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя шклозавода імя Сталіна, камбіната «Спартак», шынарамонтнага завода ў колькасці 6.000 чалавек — на сваіх перадвыбарчых сходах звярнуліся да Народнага Камісара Цяжкой прамысловасці і Шляхоў зносін СССР таварыша Лазара Майсеевіча **Кагановіча** з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Сталінскай выбарчай акрузе горада Гомеля.

25 мая выбаршчыкі Сталінскай выбарчай акругі атрымалі згоду таварыша Лазара Майсеевіча **Кагановіча** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Сталінскай выбарчай акрузе горада Гомеля.

Выбаршчыкі Куйбышэўскай выбарчай акругі № 87 горада Магілева — рабочыя, інжынерна - тэхнічныя работнікі, служачыя шоўкавай фабрыкі імя Куйбышэва, гарбарнага завода імя Сталіна, байцы і камандзіры Н-скай часці — на сваіх перадвыбарчых сходах звярнуліся да Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР таварыша Міхаіла Іванавіча **Калініна** з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Куйбышэўскай выбарчай акрузе горада Магілева.

25 мая выбаршчыкі Куйбышэўскай выбарчай акругі горада Магілева атрымалі згоду таварыша Міхаіла Іванавіча **Калініна** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Куйбышэўскай выбарчай акрузе горада Магілева.

Выбаршчыкі Мазырскай гарадской выбарчай акругі № 219 — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя заводаў «Чырвоны Кастрычнік», «Пролетарый», фабрыкі «Профінтэрн», шпаларэзнага завода «Пхоў», студэнты і выкладчыкі Мазырскага педвучылішча ў колькасці 3.500 чалавек—на сваіх перадвыбарчых сходах звярнуліся да таварыша Анастаса Іванавіча **Мікаяна** з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе.

25 мая выбаршчыкі Мазырскай гарадской выбарчай акругі атрымалі згоду таварыша Анастаса Іванавіча **Мікаяна** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе.

Выбаршчыкі Ленінскай выбарчай акругі № 261 горада Гомеля — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя завода «Рухавік рэволюцыі», млынавага камбіната, крупазавода, завода стандартных дамоў, аўтараммайстэрняў, студэнты і выкладчыкі аўтатэхнікума, фінансавага тэхнікума і інш. прадпрыемстваў на сваіх перадвыбарчых сходах звярнуліся да таварыша Андрэя Андрэевіча **Андрэева** з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе горада Гомеля.

25 мая выбаршчыкі Ленінскай выбарчай акругі атрымалі згоду таварыша Андрэя Андрэевіча **Андрэева** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе горада Гомеля.

Выбаршчыкі Валадарскай выбарчай акругі № 47 горада Віцебска — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя фабрыкі «Прагрэс» Белкомунбудтрэста, студэнты і выкладчыкі медінстытута, педагагічнага вучылішча, байцы, камандзіры і палітработнікі часцей Чырвонай Арміі ў колькасці 5.070 чалавек — на сваіх перадвыбарчых сходах звярнуліся да таварыша Андрэя Аляксандравіча **Жданава** з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Валадарскай выбарчай акрузе горада Віцебска.

25 мая выбаршчыкі Валадарскай выбарчай акругі горада Віцебска атрымалі згоду таварыша Андрэя Аляксандравіча **Жданава** балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Валадарскай выбарчай акрузе горада Віцебска.

Па атрыманні паведамлення таварышоў **Л. М. Кагановіча, М. І. Калініна, А. І. Мікаяна, А. А. Андрэева, А. А. Жданава** адбыліся нарады акруговых выбарчых камісій.

Акруговая выбарчая камісія Сталінскай выбарчай акругі № 260 горада Гомеля зарэгістравала кандыдатуру таварыша Лазара Майсеевіча **Кагановіча.**

Акруговая выбарчая камісія Куйбышэўскай выбарчай акругі № 87 горада Магілева зарэгістравала кандыдатуру таварыша Міхаіла Іванавіча **Калініна.**

Акруговая выбарчая камісія Мазырскай гарадской выбарчай акругі № 219 горада Мазыра зарэгістравала кандыдатуру таварыша Анастаса Іванавіча **Мікаяна.**

Акруговая выбарчая камісія Ленінскай выбарчай акругі № 261 горада Гомеля зарэгістравала кандыдатуру таварыша Андрэя Андрэевіча **Андрэева.**

Акруговая выбарчая камісія Валадарскай выбарчай акругі № 47 горада Віцебска зарэгістравала кандыдатуру таварыша Андрэя Аляксандравіча **Жданава.**

ПАСТАНОВА АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 166 ГОРАДА МЕНСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

таварыша ІОСІФА ВІСАРЫЁНАВІЧА СТАЛІНА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 48, 49, 50, 51 і 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанавіла:

На падставе артыкула 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Прамысловай выбарчай акрузе № 166 г. Менска вылучаную аб'яднаным перадвыбарчым сходам рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых машынабудаўнічага завода імя Варашылава, скурзавода «Бальшэвік», кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка», швейнай фабрыкі імя Крупскай, завода «Чырвоная зара», аўтарамонтнай станцыі, МГЭС-2, спіртзавода, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей, на якім прысутнічала 8.000 чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, нараджэння 1879 года, члена ВКП(б), Генеральнага Сакратара ЦК ВКП(б), пражываючага ў г. Масква—Крэмль.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» уключыць кандыдатуру таварыша Сталіна Іосіфа Вісарыёнавіча ў выбарчы бюлетэнь па Прамысловай выбарчай акрузе № 166 горада Менска.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі В. ДРАБЫШЭУСКІ.
Намеснік старшыні акруговай выбарчай камісіі Х. РАКСІН.
Сакратар акруговай выбарчай камісіі Л. ТУРЫК.
Члены камісіі: Е. ГОРАГЛЯД, П. РАПАПОРТ, М. ХВАШЧЭУСКАЯ, Д. НАХМАНОВІЧ, А. КРОТАУ, К. СІДАРОВІЧ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышу СТАЛІНУ

Родны Іосіф Вісарыёнавіч!

Найвялікшай радасцю запаліліся нашы сэрцы, калі мы даведаліся, што Вы далі сваю згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР па Прамысловай акрузе горада Менска.

Беларускі народ перажывае сёння найвялікшае шчасце і радасць, атрымаўшы вялікі гонар выбраць першым дэпутатам соцыялістычнага парламента сваёй ордэнаноснай рэспублікі Вас, любімы наш правадыр, друг і настаўнік.

Кожны патрыёт нашай вялікай радзімы, кожны партыйны і непартыйны большэвік лічыць найвялікшым гонарам і шчасцем галасаваць за таго, хто няўхільна вёў і вядзе нашу краіну па ленінскаму шляху, хто адстаяў ленінізм у баях супроць усіх ворагаў партыі і народа, чыё імя з'яўляецца баявым сцягам працоўных усяго свету,—за вялікага Сталіна.

Галасуючы за Вас, таварыш Сталін, увесь беларускі народ галасуе за нашу вялікую і непераможную партыю большэвікоў, якая пад Вашым мудрым кіраўніцтвам прывяла нас да соцыялізма і вядзе нас да зззяючых вяршынь комунізма.

Галасуючы за Вас, таварыш Сталін, беларускі народ галасуе за непарушны саюз і вялікую дружбу народаў СССР, за шчаслівае, свабоднае, раднасне жыццё мільёнаў нашай вялікай радзімы, за яшчэ больш цудоўную будучыню краіны Советаў.

Галасуючы за Вас, таварыш Сталін, мы разам з усім вялікім, магутным совецкім народам галасуем за таржаство міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, за перамогу комунізма ва ўсім свеце, за свабоду і шчасце ўсяго чалавецтва.

26 чэрвеня 1938 года беларускі народ, як адзін чалавек, апускаючы свае бюлетэні ў выбарчыя ўрны, будзе разам з усімі народамі нашай неабсяжнай радзімы дэманстраваць яшчэ раз перад усім светам сваю любоў і адданасць справе Леніна—Сталіна, геніяльнаму натхніцелю і арганізатару соцыялістычных перамог — роднаму, любімаму Сталіну.

БССР, з'яўляючыся магутным баявым фарпостам Совецкага Саюза на заходніх граніцах, асабліва сазнае, што наша аднадушнае галасаванне за доблесных патрыётаў краіны Советаў, за вялікага правадыра працоўных усяго свету таварыша Сталіна будзе ударам па ўсіх ворагах народа, па крываваму фашызму і яго гнусных агентах — трацкісцка-бухарынскіх, буржуазна-нацыяналістычных бандытах, прабуючых арганізаваць вайну супроць першай у свеце краіны соцыялізма.

Мы ведаем, што наша аднадушнае галасаванне падтрымліваецца працоўнымі дэмакратычнай Іспаніі і шматмільённым народам Кітая, якія гераічна змагаюцца супроць фашысцкіх інтэрвентаў і адстайваюць сваю нацыянальную незалежнасць.

Наша галасаванне падтрымліваецца пролетарыямі і прыгнечанымі народамі ўсяго свету, таму што ў Вас, таварыш Сталін, увасобілася воля працоўных да перамогі, магутная сіла, невычарпальная энергія і рэволюцыйны энтузіязм пролетарыяў усіх краін у барацьбе за сусветную пролетарскую рэволюцыю.

Выбіраючы Вас аднадушна, з законнай гордасцю і радасцю сваім першым дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР, мы клянемся Вам, дарагі таварыш Сталін, што па першаму закліку партыі большэвікоў, па першаму Вашаму закліку мы ўсе, як адзін, аддадзім усе нашы сілы, а калі спатрэбіцца, і жыццё за таржаство комунізма ва ўсім свеце.

Жывіце і здраствуйце доўгія, доўгія годы, родны таварыш Сталін, вядзіце нас наперад да новых перамог комунізма!

Няхай жыве наша магутная, шчаслівая соцыялістычная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве наша вялікая непераможная партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве наш любімы правадыр, наш бацька і друг, наш родны таварыш *Сталін!*

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ДЗЕРЖЫНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 168 ГОРАДА МЕНСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Вячэслава Міхайлавіча МОЛАТАВА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанавіла:

На падставе арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Дзержынскай выбарчай акрузе № 168 горада Менска, выстаўленую аб'яднаным перадвыбарчым сходам рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых фабрыкі «Кастрычнік», завода імя Мяснікова, завода «Ударнік», завода «Пролетарый», малочнага камбіната, шчотачнай фабрыкі імя Крупскай, хімзавода, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей, на якім прысутнічала 7.000 чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР таварыша Вячэслава Міхайлавіча Молатава, нараджэння 1890 года, члена ВКП(б), Старшыню Совета Народных Камісараў Саюза ССР, пражываючага ў горадзе Масква—Крэмль.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» уключыць кандыдатуру таварыша Молатава Вячэслава Міхайлавіча ў выбарчы бюлетэнь па Дзержынскай выбарчай акрузе № 168 горада Менска.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня Акруговай выбарчай камісіі Н. КАШТАНАУ.
Намеснік старшыні Акруговай выбарчай камісіі Е. НІКІФАРАВА.
Сакратар Акруговай выбарчай камісіі М. ЛІТВІНАВА.
Члены камісіі: Г. МАЛЕУ, А. ЗЕЛЕНКА, З. ЛІХАЧОВА, А. СЯРГЕЕНКА, Ш. ЦОІР, П. ШЭЛАГІНАУ.



Таварыш Сталін сярод нацыянальнасцей СССР.
Малюнак і кампазіцыя мастака П. Васільева.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышу МОЛАТАВУ

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Мы, працоўныя горада Менска, сабраліся сёння на свой многалюдны мітынг, каб выказаць бязмежную радасць, найвялікшую гордасць у сувязі з атрыманнем Вашай згоды балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР. Мы шлем Вам, вернаму саратніку вялікага Сталіна, главе магутнага совецкага ўрада гарачае і палкае прывітанне і нашу вялікую падзяку за аказанае Вамі высокае давер'е не толькі працоўным Дзержынскай выбарчай акругі г. Менска, але і ўсяму нашаму беларускаму народу.

Пад сцягам большэвіцкай партыі Леніна—Сталіна, пад геніяльным кіраўніцтвам вялікага Сталіна, пры штодзённых клопатах і дапамозе Сталінскага Цэнтральнага Камітэта, нашага магутнага совецкага ўрада, беларускі народ, як і ўсе працоўныя нашай неабсяжнай і квітнеючай радзімы, прышоў да шчаслівага і радаснага жыцця.

Вялікая партыя Леніна—Сталіна, любімы правадыр працоўных і прыгнечаных усяго свету—вялікі Сталін, яго бліжэйшыя саратнікі, у ліку якіх Вы, непахісны ленінец Вячэслаў Міхайлавіч, стварылі і ўмацавалі дзяржаўнасць нашага беларускага народа, забяспечылі росквіт нашай совецкай рэспублікі, роўнай сярод роўных, шчасце, вясёлае і радаснае жыццё. Вось чаму, сваімі першымі кандыдатамі ў совецкі парламент Беларускай рэспублікі наш народ на перадвыбарчых сходах вылучаў бацьку і друга беларускага народа вялікага Сталіна, Вас, Вячэслаў Міхайлавіч, большэвіка са слаўнай ленінска-сталінскай кагорты, вернага сталінскага саратніка прысвячаючага ўсё сваё жыццё справе рабочага класа, справе комунізма.

Мы, як і ўвесь беларускі народ, лічым для сябе найвялікшым шчасцем і гонарам мець сваімі першымі выбраннікамі ў Вярхоўным Совеце БССР любімага Сталіна і Вас, яго вернага саратніка, главу непахіснага совецкага ўрада.

Пад непераможным сцягам Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна Вы, верны сын большэвіцкай партыі, вялі і вядзеце бязлітасную барацьбу супроць вырадкаў рода чалавечага — трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай погані, якая гандлявала нашай дарагой соцыялістычнай радзімай. Ворагі народа—трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія банды разгромлены слаўнай совецкай разведкай. Шчасліва жыве беларускі народ, непахісна яго маральна-палітычнае адзінства, як ніколі ён згуртаван вакол комуністычнай партыі і любімага правадыра, настаўніка і друга — таварыша Сталіна і яго верных саратнікаў. Вось чаму мы адзіным блокам комуністаў і беспартыйных з радасцю будзем галасаваць за Вашу кандыдатуру ў Вярхоўны Совет БССР.

Мы запэўняем Вас, што будзем яшчэ лепш ахоўваць свяшчэнныя граніцы Совецкага Саюза. Не прайсці ворагу совецкіх граніц, не таптаць яму нашай свяшчэннай совецкай зямлі!

Няхай жыве дружба ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза!

Няхай жыве вялікі сын совецкага народа — Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве Сталінскі ЦК Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў!

Няхай жыве вялікі правадыр народаў, дарагі і любімы Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ МОЛАТАУСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 161 ГОРАДА МЕНСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Клімента Ефрэмавіча ВАРАШЫЛАВА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанавіла:

На падставе арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Молатаўскай выбарчай акрузе № 161 горада Менска выстаўленую аб'яднаным перадвыбарчым сходам рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых друкарні імя Сталіна, дрэваапрацоўчага завода імя Молатава, завода ланцугоў Галя, трамвайнага парка, работнікаў Клінічнага гарадка і інш., а таксама байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей, на якім прысутнічала 10 тысяч чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР таварыша Клімента Ефрэмавіча Варашылава, нараджэння 1881 года, члена ВКП(б), Народнага Камісара абароны Саюза ССР, першага маршала Совецкага Саюза, пражываючага ў гор. Масква—Крэмль.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» уключыць кандыдатуру таварыша Варашылава Клімента Ефрэмавіча ў выбарчы бюлетэнь па Молатаўскай выбарчай акрузе № 161 горада Менска.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Г. МАНДРЫК.
Намеснік старшыні акруговай выбарчай камісіі Ф. ПАПОУ.
Сакратар акруговай выбарчай камісіі А. УС.
Члены камісіі: С. КАЦОВІЧ, Е. ПЕУЗНЕР, П. КАРАЧУН, А. МАРКАУ, Я. РЭДЗЬКО, Л. КОГАН.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Кліменту Ефрэмавічу ВАРАШЫЛАВУ

Дарагі і любімы наш Клімент Ефрэмавіч!

Мы, працоўныя горада Менска, сабраліся сёння на агульнагарадскі мітынг выказаць сваю радасць у сувязі з атрыманнем Вашай згоды балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР і шлем мы Вам гарачае прывітанне і вялікую ўдзячнасць за аказанае Вамі вялікае давер'е.

Пад сцягам Леніна—Сталіна, пад геніяльным кіраўніцтвам вялікага Сталіна працоўныя БССР, як і ўсе працоўныя нашай вялікай радзімы, прышлі да шчаслівага і раднаснага жыцця.

Шчаслівы народ Совецкай Беларусі, які стаіць верным фарпостам СССР на рубяжы з капіталістычным светам, горача любіць сваю родную Чырвоную Армію і яе жалезнага наркома — Клімента Ефрэмавіча Варашылава. Ваша імя праслаўлена ў натхнёных і радасных песнях нашага шчаслівага беларускага народа.

Беларускі народ лічыць для сябе найвялікшым шчасцем і гордасцю мець сваім выбраннікам у Вярхоўны Совет БССР першага маршала Совецкага Саюза, жалезнага наркома абароны — Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Ад імя ўсяго беларускага народа запэўнлем Вас, што ў сваёй большэвіцкай рабоце на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, мы яшчэ больш узнімем рэволюцыйную пільнасць, яшчэ больш разгорнем барацьбу за выкарчоўванне астаткаў трацкісцка-бухарынскай нечысці. Мы апраўдаем аказанае Вамі давер'е і ў любы час пад Вашым кіраўніцтвам мы гатовы даць сакрушальны адпор любому ворагу, які адважыцца дакрануцца да нашых свяшчэнных граніц.

Няхай жыве першы маршал Совецкага Саюза, жалезны нарком абароны— Клімент Ефрэмавіч Варашылаў!

Няхай жыве наша вялікая комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш родны бацька таварыш Сталін!

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЛЕНІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 48 ГОРАДА ВІЦЕБСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Нікалая Іванавіча ЕЖОВА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанавіла:

На падставе артыкула 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе № 48 вылучаную агульнымі сходамі рабочых, інжынераў і тэхнікаў, служачых фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», шчаціннага камбіната імя Куйбышэва, ігольнага завода, цагельных заводаў, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі, студэнтаў і педагагічнага персанала Ветзааінстытута, на якіх прысутнічала 9.000 чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР Нікалая Іванавіча Ежова, 1895 года нараджэння, члена ВКП(б), Наркома ўнутраных спраў і воднага транспарту Саюза ССР, пражываючага ў гор. Маскве.

На падставе артыкула 57 «Палажэння аб выберах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Ежова Нікалая Іванавіча ў выбарчы бюлетэнь па Ленінскай выбарчай акрузе № 48 горада Віцебска.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі КЕДРАУ.
Намеснік старшыні акруговай выбарчай камісіі МАСАРСКІ.
Сакратар ПІРАЦІНСКАЯ.
Члены камісіі: ЛЕВІТ, ХАДАРЭНКА, МІЛЬЧЫН, МІРКІНА, САМУЙЛАВА, МАЦКЕВІЧ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

СТАЛІНСКАМУ НАРКОМУ УНУТРАНЫХ СПРАЎ

таварышу ЕЖОВУ

Дарагі Нікалай Іванавіч!

З найвялікшай радасцю і гордасцю даведаліся мы аб тым, што Вы, верны саратнік і друг вялікага Сталіна, баявы кіраўнік слаўных чэкістаў, выказалі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета ордэнаноснай БССР.

Мы выказваем Вам сваю глыбокую падзяку за вялікі гонар і давер'е, аказанае Вамі працоўным Совецкай Беларусі.

Увесь беларускі народ будзе 26 чэрвеня з найвялікшай радасцю галасаваць за любімага Сталіна, за яго верных і бліжэйшых саратнікаў таварышаў Молатава, Варашылава, Ежова.

З Вашым, таварыш Ежоў, слаўным імем кожны совецкі патрыёт звязвае перамогу над злейшымі ворагамі народа — трацкістамі, бухарынцамі, буржуазнымі нацыяналістамі — фашысцкімі шпіёнамі, чые каварныя замыслы раскрыты бліскучай работай совецкай разведкі.

Мы ведаем і горача любім Вас, родны таварыш Ежоў, за тое, што пад Вашым кіраўніцтвам гіганцка вырасла несакрушальная магутнасць і моц совецкай разведкі — вастрэйшага меча дыктатуры рабочага класа, які бязлітасна і метка разіць ворагаў, пасягаючых на жыццё і шчасце совецкага народа.

Усё Ваша жыццё звязана з жыццём і барацьбой партыі Леніна—Сталіна, з жыццём і барацьбой совецкага народа за справу комунізма.

Мы запэўняем Вас, дарагі таварыш Ежоў, што не пашкадуем усіх сваіх сіл для таго, каб апраўдаць аказаныя нам вялікае давер'е і гонар; мы акружым яшчэ большай любоўю, увагай і клопатамі нашых слаўных наркамунутдзельцаў, мы акажам яшчэ больш дапамогі і падтрымання нашай роднай совецкай разведцы, якая пад мудрым вадзіцельствам вялікага Сталіна, пад Вашым, таварыш Ежоў, большэвіцкім кіраўніцтвам разграміла фашысцкія гнёзды, без астатку выкарчуе і ачысціць совецкую зямлю ад варожай пакасці, выкараніць да канца ўсіх да аднаго ворагаў соцыялізма.

Мы цвёрда ўпэўнены, што і ў далейшым Вы, дарагі таварыш Ежоў, з яшчэ большай бязлітаснасцю і непрымірымасцю будзеце разіць трапна і без промаха фашысцкіх наймітаў, з яшчэ большай страснасцю будзеце змагацца за нашу агульную справу, за справу Леніна—Сталіна, за комунізм.

Няхай жыве наша квітнеючая соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве вялікі і магутны совецкі народ!

Няхай жыве верны сын совецкага народа, верны саратнік і друг вялікага Сталіна, слаўны кіраўнік совецкай разведкі таварыш Ежоў!

Няхай жыве вялікі і мудры правадыр народаў родны таварыш **Сталін!**

Якуб Колас

ВЯЛІКАМУ АБРАННІКУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Як светлае ранне,
Абнятае сонцам,
Расходзіцца радасць
Па нашай старонцы.
І кожны ўсхвалёван,
І кожны узнят:
Ён—родны наш Сталін.
—Ён наш дэпутат!
Напоўнены сэрцы
Пачуццем высокім,
Нас гордасць шугае
Патокам глыбокім.
Шуміць наша радасць,
Як майскі парад:
Праслаўлены геній —
Ён—наш дэпутат!

І Молатаў — розум
Совецкай Дзяржавы,
І Клім Варашылаў —
Шчыт воінскай славы,
І воркія вочы
Вялікай зямлі, —
Ежоў наш любімы,
Нам згоду далі!
Падымем-жа вышэй
Чырвоныя сцягі!
Дастойнымі будзьма
Вялікай увагі.
Каб любы наш Сталін,
Зірнуўшы на нас,
Сказаў-бы: «Хвалю я,
Таварышы, вас».

24 мая, 1938 г.

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ СЛАЎНЫЯ КАНДЫДАТЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА!

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ СТАЛІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 260 ГОРАДА ГОМЕЛЯ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Лазара Майсеевіча КАГАНОВІЧА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанавіла:

На падставе артыкула 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Сталінскай выбарчай акрузе № 260 гор. Гомеля выстаўленую аб'яднанымі перадвыбарчымі сходамі рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых шклозавода імя Сталіна, камбіната «Спартак», фабрыкі імя Клары Цэткін, клінкернага завода, аўчына-шубнага завода, інструментальнага завода, на якіх прысутнічала 6 тысяч чалавек, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР тав. Лазара Майсеевіча Кагановіча, 1893 года нараджэння, члена ВКП(б), народнага камісара цяжкой прамысловасці і шляхоў зносін СССР, пражываючага ў гор. Масква—Крэмль.

На падставе артыкула 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Лазара Майсеевіча Кагановіча ў выбарчы бюлетэнь па Сталінскай выбарчай акрузе № 260 гор. Гомеля.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Г. ЯРЛЫКОЎ.
Намеснік старшыні А. МАСЮКОВА.
Сакратар Ф. ВІГДАРОВІЧ.
Члены камісіі: М. ПЛОТКІН, П. КУНЦЭВІЧ, М. ПРУДНІКАВА, Л. ПЛОТКІН, В. ПАІНА, М. АХРЭМЧЫК.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЛЕНІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 261 ГОРАДА ГОМЕЛЯ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Андрэя Андрэевіча АНДРЭЕВА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанавіла:

На падставе арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе № 261 выстаўленую агульнымі сходамі рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода «Рухавік рэволюцыі», крупзавода, млынкамбіната, завода стандартных дамоў, ленавых устаноў, Днепра-Дзвінскага рачнога параходства, палітасветных устаноў, на якіх прысутнічала 7.000 чалавек, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР таварыша Андрэя Андрэевіча Андрэева, нараджэння 1895 года, члена ВКП(б), Сакратара ЦК ВКП(б), пражываючага ў горадзе Масква—Крэмль.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» уключыць кандыдатуру таварыша Андрэева Андрэя Андрэевіча ў выбарчы бюлетэнь па Ленінскай выбарчай акрузе № 261 горада Гомеля.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі С. А. ФІЛІПЕК.
Намеснік старшыні А. К. СТАРАСЦЕНКА.
Сакратар Е. М. ГРЫЎНІНА.
Члены камісіі: А. І. ХІМАКОЎ, Б. З. ЛАБКОЎСКІ, Ф. Я. КРАЕЎСКІ, Ф. Ш. КАЗЛОВА, П. С. КАВАЛЕЎ, І. А. ДАНІЛАЎ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышам Л. М. КАГАНОВІЧУ і А. А. АНДРЭЕВУ

Дарагія Лазар Майсеевіч і Андрэй Андрэевіч!

З найвялікшым уздымам, радасцю і гордасцю даведаліся мы, што вялікі Сталін, таварышы Молатаў, Варашылаў, Калінін, Мікаян, Ежоў, Жданаў і вы, дарагія таварышы Кагановіч і Андрэеў, далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР. З вялікім энтузіязмам беларускі народ будзе галасаваць у гістарычны дзень 26 чэрвеня за сваіх першых кандыдатаў, за любімага Сталіна і яго слаўных саратнікаў, за тых, хто вядзе нашу краіну ад адной перамогі да другой, за тых, хто забяспечыў беларускаму народу, як і ўсім народам нашай вялікай радзімы, шчаслівае і радаснае жыццё.

Мы асабліва рады і ганарымся тым, што Вы, наш любімы сталінскі нарком, кіраўнік і арганізатар Палескага камітэта большэвікоў, дарагі Лазар Майсеевіч, далі сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты соцыялістычнага парламента ордэнаноснай Беларускай ССР па Сталінскай выбарчай акрузе гор. Гомеля.

Мы таксама рады і ганарымся тым, што Вы, Андрэй Андрэевіч, далі сваю згоду балатыравацца па Ленінскай выбарчай акрузе горада Гомеля ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР.

Працоўныя Гомельшчыны добра памятаюць Вашу, Лазар Майсеевіч, работу ў перыяд барацьбы за ўстанаўленне ўлады советаў на тэрыторыі Палесся, памятаюць як Вы ўзначальвалі падпольны Палескі камітэт большэвікоў і вялі рашучую барацьбу з ворагамі рабочага класа.

Пад Вашым кіраўніцтвам совецкі чыгуначны транспарт узняўся ўгору і сістэматычна перавыконвае дзяржаўныя заданні. Пад Вашым кіраўніцтвам цяжкая прамысловасць заняла перадавое месца сярод астатніх галін нашай народнай гаспадаркі. Мы ў гэтым упэўнены таму, што Вы, таварыш Кагановіч, з'яўляецеся верным саратнікам вялікага Сталіна, валодаеце сталінскім стылем кіраўніцтва, па-сталінску выхоўваеце і вырошчваеце кадры; таму, што Вы з'яўляецеся верным сынам рабочага класа, адданым да канца вялікай справе Леніна—Сталіна.

Мы запэўняем вас, дарагія Лазар Майсеевіч і Андрэй Андрэевіч, што будзем працаваць так, як вучыць нас таварыш Сталін, каб апраўдаць высокае давер'е, якое вы аказалі нам, даўшы сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР по гораду Гомелю.

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве наш любімы сталінскі нарком чыгуначнага транспарта і цяжкой прамысловасці Лазар Майсеевіч Кагановіч!

Няхай жыве верны сын партыі Андрэй Андрэевіч Андрэеў!

Няхай жыве вялікі правадыр народаў, наш першы кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, наш любімы бацька, друг і настаўнік таварыш Сталін!

У СЭРЦЫ ГОРДАСЦЬ ЗА НАШУ КРАІНУ

Цяжка выказаць словамі ўсё шчасце і гордасць, якія адчуваеш разам з усім беларускім народам пры радаснай вестцы аб згодзе вялікага, мудрага і любімага **Сталіна** і яго бліжэйшых саратнікаў—главы совецкага ўрада **Вячэслава Міхайлавіча Молатава**, жалезнага наркома абароны **Кліментa Ефрэмавіча Варашылава** і кіраўніка слаўнай совецкай разведкі **Нікалая Іванавіча Ежова**—балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Дзень, калі я даведаўся аб гэтай радаснай вестцы, — адзін з самых светлых, незабыўных дзён у маім жыцці.

Выходзіш на святочную вуліцу нашай сталіцы, ажыўленую і ўзбуджаную як ніколі, і ўсюды—радасныя твары, шчаслівыя ўсмешкі, зззяючыя шчасцем вочы. І ў сэрцы расце гордасць за нашу краіну, за нашу прыгожую сапраўднасць, за наша цудоўнае жыццё.

У такі дзень асабліва моцна жаданне адлюстраваць у вялікім, сапраўды мастацкім творы ўсю веліч народнага ўздыму, народнага лікавання, гэтага велізарнага пачуцця, якое перапаўняе сэрцы грамадзян нашай рэспублікі ў дзень агалашэння гістарычных дакументаў аб згодзе найвялікшага чалавека эпохі, да якога звернуты погляды ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва, таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў—таварышоў Молатава, Варашылава і Ежова балатыравацца ў вярхоўны орган Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Хочацца аддаць усе свае сілы, усе свае здольнасці на стварэнне сапраўды вартых эпохі Сталінскай Канстытуцыі мастацкіх твораў, апяваючых непарушную дружбу ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза, грозную магутнасць нашай радзімы, гатоўнасць усяго нашага народа сцерці з твару зямлі ўсе чорныя сілы фашызма, калі яны пасмеюць напасці на нас.

М. А. ЗОРАЎ,
рэжысёр Белдзярждрамтэатра.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ КУЙБЫШЭЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 87 ГОРАДА МАГІЛЕВА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Міхаіла Іванавіча КАЛІНІНА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанавіла:

На падставе арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Куйбышэўскай выбарчай акрузе № 87 горада Магілева выстаўленую перадвыбарчымі сходамі рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых шоўкавай фабрыкі імя Куйбышэва, скурзавода імя Сталіна, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей, на якіх прысутнічалі 4.500 чалавек, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР таварыша Міхаіла Іванавіча Калініна, нараджэння 1875 года, члена ВКП(б), Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, пражываючага ў горадзе Масква—Крэмль.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» уключыць кандыдатуру таварыша Калініна Міхаіла Іванавіча ў выбарчы бюлетэнь па Куйбышэўскай выбарчай акрузе № 87 горада Магілева.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Х. САГАЛ.
Намеснік старшыні І. ВАЙМАН.
Сакратар камісіі А. КАРАСОВА.
Члены камісіі: В. ІВАНОВА, Н. МІТРАФАНАЎ, М. СЕЛЕДЦОВА, Г. РЫСІНА, К. КАРНЕЕЎ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышу М. І. КАЛІНІНУ

Мы, выбаршчыкі Куйбышэўскай выбарчай акругі № 87 горада Магілева, з велізарнай радасцю сустрэлі Вашу згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па нашай выбарчай акрузе.

Няма для нас большай радасці і гонару, чым той, які Вы аказалі нам і ў нашай асобе ўсяму беларускаму народу.

У гэты дзень, калі мы атрымалі радасную вестку аб Вашай згодзе балатыравацца ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР, мы першыя словы гарачай любві і адданасці звяртаем да таго, пад чыім кіраўніцтвам наша краінаператварылася ў магутную індустрыяльную дзяржаву, у краіну буйнага соцыялістычнага земляробства, у краіну, дзе квітнее непарушная дружба народаў нашай радзімы, — да таго, хто з'яўляецца нашым жыццём і радасцю, — геніяльнага правадыра народаў, да таварыша Сталіна.

У Вашай асобе комуністычная партыя і ўвесь совецкі народ маюць непахіснага барацьбіта за комунізм. Вы з'яўляецеся бліжэйшым саратнікам таварыша Сталіна. Вы разам з Леніным і Сталіным вялі барацьбу супроць усіх і ўсякіх ворагаў народа, супроць трацкісцка-бухарынскіх наймітаў фашызма, мацавалі і мацуеце магутнасць большэвіцкай партыі, стварылі маральна-палітычнае адзінства совецкага народа вакол партыі Леніна—Сталіна.

Гістарычныя перамогі соцыялізма ў нашай краіне, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, цесна звязаны з Вашым імем, з Вашай шматгадовай работай на пасту старшыні першага соцыялістычнага парламента.

Няма большай радасці, няма большага шчасця, чым жыць і працаваць у Сталінскую эпоху, у эпоху самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі і галасаваць за кандыдатаў непераможнага блока комуністаў і беспартыйных.

Дарагі Міхаіл Іванавіч! Мы з радасцю ўсе, як адзін, аддадзім за Вас свае галасы як за вернага сына партыі Леніна—Сталіна, адданага барацьбіта за справу комунізма.

Прыміце-ж, дарагі Міхаіл Іванавіч, нашу шчырую падзяку за аказанае нам давер'е.

Жадаем Вам доўгіх і доўгіх год плённай работы на страх ворагам, на карысць вялікаму совецкаму народу!

Няхай жыве магутны блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве наша вялікая партыя Леніна—Сталіна і яе правадыр таварыш Сталін!

Няхай жыве наш кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР Міхаіл Іванавіч Калінін!

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ МАЗЫРСКАЙ ГАРАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 219 ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ТАВАРЫША

Анастаса Іванавіча МІКАЯНА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 48, 49, 50, 51 і 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанавіла:

На падставе арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе № 219 вылучаную агульнымі сходамі рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых мазырскага фанернага завода «Чырвоны Кастрычнік», лесазавода «Пролетарый», фабрыкі «Профінтэрн», шпаларэзнага завода «Пхоў», настаўнікамі і студэнтамі Мазырскага педагагічнага вучылішча, на якіх прысутнічала 3.500 чалавек,—кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР Анастаса Іванавіча Мікаяна, нараджэння 1895 года, члена ВКП(б), члена Палітбюро ЦК ВКП(б), намесніка старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР, пражываючага ў горадзе Маскве.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Мікаяна Анастаса Іванавіча ў выбарчы бюлетэнь па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе № 219 горада Мазыра.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня Мазырскай акруговай выбарчай камісіі М. Я. ДУБІНСКІ.
Намеснік старшыні І. Л. ГЛУШАК.
Сакратар І Д. НЕСЦЯРОВІЧ.
Члены камісіі: А. І. ВАЛОНКІН, А. П. ЕСЮТКІН, Н. А. ДАНІЛАЎ, А. Я. САВІЛАВА, І. С. МАЙСЕЕНКА, Ш. І. БЕРМАН.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышу А. І. МІКАЯНУ

АД РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ ФАНЕРНАГА ЗАВОДА «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК»

Дарагі Анастас Іванавіч!

Ваша згода балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па нашай Мазырскай гарадской выбарчай акрузе выклікала ў нас пачуцці бязмежнай радасці за высокі гонар, аказаны нам сталінскім Цэнтральным Камітэтам, нашым саюзным урадам і асабіста Вамі, таварыш Мікаян.

Мы ведаем Вас, таварыш Мікаян, як лепшага большэвіка, цалкам і поўнасцю адданага справе партыі Леніна—Сталіна, які пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна каваў перамогу совецкага народа ў годы грамадзянскай вайны. Мы ведаем Вас, як лепшага саратніка вялікага Сталіна, арганізатара перамог соцыялізма, аддаючага ўсю сваю большэвіцкую энергію на шчасце і радасць совецкага народа. Вось чаму, таварыш Мікаян, мы лічым для сябе вялікім шчасцем галасаваць за Вас, за нашу любімую комуністычную партыю большэвікоў, за нашага роднага таварыша Сталіна. Запэўняем Вас, што аказанае давер'е мы з гонарам апраўдаем. Мы будзем працаваць стаханаўскімі метадамі і дзень выбараў у свой соцыялістычны парламент — 26 чэрвеня — сустрэнем новымі вытворчымі перамогамі.

Няхай жыве наша слаўная комуністычная партыя!

Няхай жыве слаўны сын совецкага народа таварыш Мікаян!

Няхай жыве наш правадыр і бацька ўсіх працоўных таварыш Сталін!

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ВАЛАДАРСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 47 ГОРАДА ВІЦЕБСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ТАВАРЫША

Андрэя Аляксандравіча ЖДАНАВА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51, 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», пастанавіла:

На падставе арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Валадарскай выбарчай акрузе № 47 горада Віцебска выстаўленую агульнымі сходамі рабочых інжынераў, тэхнікаў і служачых фабрыкі «Прагрэс», Белкамунбудтрэста, студэнтаў, настаўнікаў і навуковых работнікаў медінстытута, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей Віцебскага гарнізона, а таксама студэнтаў і выкладчыкаў педвучылішча, педрабфака і хімтэхнікума, на якіх прысутнічала 5.070 чалавек, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыша Андрэя Аляксандравіча Жданава, 1896 года нараджэння, члена ВКП(б), Сакратара ЦК ВКП(б) і Ленінградскага абкома і гаркома ВКП(б), пражываючага ў горадзе Ленінградзе.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» уключыць кандыдатуру таварыша Жданава Андрэя Аляксандравіча ў выбарчы бюлетэнь па Валадарскай выбарчай акрузе № 47 горада Віцебска.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі І. МАТВЕЕЎ.
Намеснік старшыні Н. ВУЛЬФОВІЧ.
Сакратар Е. МАРОЗАВА.
Члены камісіі: К. РЫБАКОЎ, Ф. ШЭЙКІН, Е. КАЗЛОЎ, А. БАБАШЫНСКАЯ, Э. ЛІДОЎСКІ.

ЛЕНІНГРАД—таварышу ЖДАНАВУ.

ВЫБАРШЧЫКІ ВАЛАДАРСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ гор. ВІЦЕБСКА таварышу А. А. ЖДАНАВУ

Дарагі Андрэй Аляксандравіч!

Беларускі народ удастоіўся вялікага гонару. Вялікі, мудры Сталін, яго бліжэйшыя саратнікі далі сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Лікаванню беларускага народа няма граніц.

Сёння да нашай вялікай радасці прыбавілася яшчэ адна, новая радасць. Вы, Андрэй Аляксандравіч, далі згоду балатыравацца па Валадарскай выбарчай акрузе горада Віцебска.

Вы вядомы нашай радзіме як непахісны барацьбіт за шчасце працоўных. Куды-б Вас партыя ні пасылала, дзе-б Вы ні працавалі, Вы паказваеце сталінскі стыль большэвіцкага кіраўніцтва.

Калі подлая трацкісцка-бухарынская банда фашысцкіх забойцаў зверска забіла незабыўнага трыбуна пролетарскай рэволюцыі Сяргея Міронавіча Кірава, партыя паставіла Вас на чале партыйных і непартыйных большэвікоў горада Леніна. Пад Вашым кіраўніцтвам рабочы клас і калгаснае сялянства Ленінградскай вобласці дабіліся новых поспехаў у галіне развіцця соцыялістычнай прамысловасці, калгаснага будаўніцтва, совецкай навукі і мастацтва.

Вы выхоўваеце працоўных Ленінградскай вобласці і ўвесь совецкі народ у духу гарачай любві і адданасці да партыі Леніна—Сталіна, у духу палкай нянавісці да яе ворагаў.

Мы бязмежна рады, што разам з вялікім Сталіным і яго вернымі саратнікамі таварышамі Молатавым, Варашылавым, Кагановічам, Калініным, Мікаянам, Андрэевым, Ежовым мы будзем мець сваім пасланцом у соцыялістычным парламенце нашай ордэнаноснай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі Вас, дарагі Андрэй Аляксандравіч.

Мы запэўняем Вас, наш дарагі таварыш Жданаў, што ў гістарычны дзень 26 чэрвеня ўвесь беларускі народ з радасцю пойдзе да выбарчых урнаў і аддасць свае галасы за кандыдатаў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве непарушная дружба народаў Совецкага Саюза!

Няхай жыве наш кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыш Жданаў!

Няхай жыве вялікі правадыр, сцяг соцыялістычных перамог — таварыш Сталін!

ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ ОРДЭНАНОСНАЙ БССР

ЗВАРОТ

150-тысячнага мітынга працоўных, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей, які адбыўся ў г. Менску

Дарагія таварышы!

Няма межаў нашай радасці, нашаму шчасцю і гордасці!

Вялікі правадыр народаў, наш бацька, друг і настаўнік, горача любімы Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін** даў сваю згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР.

Верныя саратнікі таварыша Сталіна глава совецкага ўрада Вячэслаў Міхайлавіч **Молатаў**, Нарком Абароны СССР — дэпутат Вярхоўнага Совета Саюза ССР ад выбаршчыкаў горада Менска, першы маршал Совецкага Саюза Клімент Ефрэмавіч **Варашылаў**, сталінскі нарком унутраных спраў, кіраўнік слаўнай совецкай разведкі — Нікалай Іванавіч **Ежоў** — аказалі нам высокі гонар, даўшы сваю згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Гэта радасная вестка спаткана намі з пачуццём вялікай гордасці, з энтузіязмам, з пачуццём гарачай любві і беззаветнай адданасці да вялікага Сталіна і яго верных бліжэйшых саратнікаў.

Таварышу Сталіну і яго слаўным саратнікам абавязан беларускі народ сваімі вялікімі перамогамі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва, разгромам трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай нечысці.

Таварышу Сталіну і яго саратнікам абавязан беларускі народ бліскучым росквітам сваёй культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.

Таварышы рабочыя Совецкай Беларусі!

На згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР вялікага Сталіна і яго верных саратнікаў таварышаў Молатава, Варашылава і Ежова — адкажам новым вытворчым уздымам, далейшым разгортваннем стаханаўскага руху, умацаваннем барацьбы за якасць выпускаемай прадукцыі, за новыя соцыялістычныя нормы працы.

Таварышы калгаснікі Совецкай Беларусі!

На згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР вялікага Сталіна і яго саратнікаў таварышаў Молатава, Варашылава і Ежова — адкажам узмацненнем барацьбы за высокі сталінскі ўраджай, за 7—8 мільярдаў пудоў хлеба, за далейшы рост і росквіт заможнага і культурнага жыцця.

Таварышы работнікі навукі і мастацтва Совецкай Беларусі!

На згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР вялікага Сталіна і яго саратнікаў таварышаў Молатава, Варашылава і Ежова—адкажам упартай творчай работай над узняццем совецкай перадавой навукі і беларускай соцыялістычнай культуры на яшчэ вышэйшую ступень.

Працоўныя Совецкай Беларусі!

Набліжаецца дзень вялікага народнага свята — 26 чэрвеня, дзень выбараў Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

У гэты радасны дзень мы ўсе, як адзін, прадэманструем сваё маральна-палітычнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол большэвіцкай партыі ў перамозе блока комуністаў і беспартыйных. У гэты дзень мы з любоўю і гордасцю аддадзім свае галасы за лепшага друга беларускага народа таварыша Сталіна, за яго верных бліжэйшых саратнікаў таварышаў Молатава, Варашылава і Ежова, за самых стойкіх і адданых сыноў і дочак беларускага народа, доблесных патрыётаў соцыялістычнай Радзімы.

Няхай жыве Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка — магутны баявы фарпост Совецкага Саюза на яго заходніх граніцах!

Няхай жыве наша доблесная совецкая разведка і яе баявы кіраўнік сталінскі нарком унутраных спраў таварыш **Ежоў!**

Няхай жыве наша слаўная геройчная Чырвоная Армія і жалезны нарком абароны, першы маршал Совецкага Саюза таварыш **Варашылаў!**

Няхай жыве самы дэмакратычны і самы магутны ў свеце совецкі ўрад і яго мудры кіраўнік таварыш **Молатаў!**

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна і геніяльны правадыр комунізма—наш родны, любімы Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін!**

Працоўныя Віцебска — таварышу Н. І ЕЖОВУ

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Нікалаю Іванавічу ЕЖОВУ

Дарагі Нікалай Іванавіч!

Працоўныя прамысловага Віцебска— комуністы і беспартыйныя, 18-гадовыя юнакі і дзяўчаты і дасягнуўшыя старых год, усе аднадушна вылучылі Вашу кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Па адной толькі Ленінскай выбарчай акрузе нашага горада было паднята 9 тысяч рук за тое, каб Вы былі нашым пасланцом у беларускім совецкім парламенце.

Рабочы клас Віцебска добра помніць, як яшчэ ў годы вялікага Кастрычніцкага штурму ў нас на Віцебшчыне, працуючы ў ваенных майстэрнях, Вы згуртоўвалі большэвіцкую арганізацыю, мабілізоўвалі рабочых і сялян на перамогу над фабрыкантамі, памешчыкамі і кулакамі.

Мы помнім, як яшчэ ў 1917 годзе Вы грамілі гнусных здраднікаў — меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў і іх бандыцкіх главароў Тарле, Гінзбурга, засеўшых са сваім штабам у былой Аляксееўскай гімназіі. Мы помнім, як у тыя дні на заклік большэвіцкай партыі нацягнуліся групы добраахвотнікаў з рабочых і сялян, уступаўшых у Чырвоную гвардзію. Па 50—100 чалавек прыходзілі асабіста да Вас, таварыш Ежоў, з просьбай даверыць ім зброю, адправіць на фронт абараняць маладую совецкую рэспубліку.

Вуснамі вялікага акына Джамбула ўвесь совецкі народ успамінае:

...Я прошлое помню. В закатах багровых
Я вижу сквозь дым комиссара Ежова.
...Сверкая булатом, он смело ведет
В атаки, одетый в шинели, народ.
...Он бьется, учась у великих батыров,
Таких, как Серго, Ворошилов и Киров.

Ужо тады Вы сябе паказалі непахісным ленінцам, сталінцам, непахісным барацьбітом за шчасце працоўных, верным сынам свайго рабочага класа. З таго часу Вы цвёрда ідзеце па ленінска-сталінскаму шляху і ўсюды, куды Вас пасылаюць, Вы паказваеце ўсім нам прыклад, як трэба горача любіць сваю соцыялістычную радзіму і ненавідзець яе ворагаў.

Не пазнаць сёння наш Віцебск, дзе Вы, у ходзе Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, працавалі і змагаліся за справу Леніна—Сталіна, як не пазнаць усе гарады і сёлы нашай рэспублікі. На тым месцы, дзе ў 1917 годзе былі размешчаны захудалыя ваенныя майстэрні, зараз красуюцца станкабудаўнічы завод імя Кірава, швейная фабрыка «Профінтэрн», абутковая фабрыка «Чырвоны Кастрычнік». Дзве сталінскія пяцігодкі далі нам такіх прыгажуноў-гігантаў, як швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», дзе ў прасторных светлых карпусах славяць сваю працу 5 тысяч рабочых, панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ», на якой 8-тысячны маладзёжны калектыў працуе на навейшых машынах совецкай вытворчасці.

Віцебск — у мінулым гандлёва-мяшчанскі, чыноўніцка-губернскі горад з мноствам цэркваў, сінагог, касцёлаў і шыльдаў гандляроў, — сёння ператварыўся ў прамысловы абласны цэнтр з многімі прадпрыемствамі, шырокай сеткай вышэйшых навучальных устаноў, сталінскіх школ, клубаў, больніц і дзесяткамі іншых культурна-бытавых устаноў. Шырокія калгасныя палі, якія даюць багаты ўраджай, выцеснілі вузкія непладародныя палоскі. Бедныя сялянскія хібаркі адышлі ў мінулае, як адышло ўсё горкае жыццё былых батракоў і беднякоў беларускай вёскі, сёнешніх заможных калгаснікаў. Яны саступілі месца прыгожым калгасным дамам і прасторным пабудовам. Стальны конь апрацоўвае нашы калгасныя палі. Горкае, як палын, жыццё рабочых і сялян стала радасным і вясёлым. Наша шчаслівае, радаснае жыццё, нашы вялікія правы залатымі літарамі запісаны ў сталінскім законе, у асноўных законах саюзных рэспублік.

На нашы вялікія правы свабодных грамадзян Совецкай Беларусі, як і на правы працоўных нашых братніх рэспублік, пасягалі прэзрэнныя шакалы, трацкісцка-бухарынскае і нацыянал-фашысцкае ахвосце. І Вам, дарагі Нікалай Іванавіч, мы абавязаны тым, што, выконваючы волю вялікага Сталіна, волю ўсяго совецкага народа, пад Вашым кіраўніцтвам наша слаўная совецкая разведка знішчыла гэтыя асіныя гнёзды.

Вось чаму мы з такой радасцю вылучалі Вас кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, і сёння, калі мы даведаліся аб Вашай згодзе балатыравацца па Ленінскай выбарчай акрузе горада Віцебска, нашай радасці, нашаму лікаванню няма граніц. Мы ведаем, што ў Вашай асобе мы маем крыштальна чэснага, непахіснага змагара за справу Леніна—Сталіна. І ў гістарычны дзень — 26 чэрвеня ўсе нашы галасы мы аддадзім Вам, Нікалай Іванавіч, і лепшым людзям нашай соцыялістычнай радзімы.

Мы абяцаем Вам, што ўсе мы—партыйныя і непартыйныя большэвікі — будзем актыўна дапамагаць нашым слаўным совецкім разведчыкам у канчатковым выкарчоўванні і знішчажэнні ўсіх ворагаў народа. У патрэбную мінуту, па першаму закліку нашай большэвіцкай партыі, совецкай улады, па першаму закліку вялікага Сталіна мы ўсе, як адзін, грудзьмі станем на абарону нашай горача любімай соцыялістычнай радзімы.

Няхай жыве вялікая дружба народаў Саюза ССР!

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве слаўная совецкая разведка і яе сталінскі кіраўнік Нікалай Іванавіч Ежоў, чыё імя выклікае жах і нянавісць у ворагаў нашай радзімы, радасць і любоў вялікага совецкага народа!

Няхай жыве наш першы кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, вялікі прадаўжальнік справы Леніна, любімы правадыр мільёнаў, наш дарагі, родны Сталін!

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ, ДА СОВЕЦКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ ГРУЗІНСКАЙ І УКРАІНСКАЙ СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

Працоўныя Совецкай Беларусі днямі атрымалі пісьмы ад калгаснікаў калгасаў «Шрома», Грузінскай ССР і імя Чапаева, Украінскай ССР. Гэтыя пісьмы, ўмацоўваючыя інтэрнацыянальнае адзінства і сталінскую дружбу народаў СССР, натхняюць нас на новыя перамогі.

Працоўныя сталіцы ордэнаноснай Совецкай Беларусі прымаюць выклік працоўных Грузіі і Украіны на ўзорнае правядзенне выбараў Вярхоўнага Совета БССР і, пасылаючы палкае прывітанне вам — працоўным брацкіх рэспублік, хочуць падзяліцца з вамі сваёй вялікай радасцю.

Правадыр народаў Совецкага Саюза, творэц Сталінскай Канстытуцыі, Іосіф Вісарыёнавіч Сталін і яго верныя саратнікі — глава совецкага ўрада Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў, жалезны нарком абароны Клімент Ефрэмавіч Варашылаў і сталінскі нарком унутраных спраў Нікалай Іванавіч Ежоў далі сваю згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР.

Гэта вестка з маланкавай хуткасцю абляцела ўсю Совецкую Беларусь і выклікала найвялікшую радасць і лікаванне ўсяго беларускага народа, бо ён мае вялікае шчасце выбраць у свой соцыялістычны парламент першым дэпутатам сваім Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, свайго бацьку, друга і настаўніка, які вывеў Беларусь з праклятага цяжкага мінулага, які даў беларускаму народу дзяржаўнасць, які стварыў беларускаму народу шчаслівае жыццё.

Беларускі народ поўны законнай гордасці і радасці, што ён будзе выбіраць у свой Вярхоўны Совет непахісных большэвікоў, саратнікаў таварыша Сталіна таварышаў Молатава, Варашылава і Ежова, імёны якіх дарагі і горача любімы кожным працоўным БССР.

Мы жывем заможна, культурна і шчасліва. Але мы ніколі не забываем, што мы жывем на граніцы з капіталістычным Захадам. Мы кожны дзень чуем бразганне зброяй суседніх і несуседніх з намі фашысцкіх дзяржаў, банды якіх мы білі ў свой час, пад кіраўніцтвам вялікай комуністычнай партыі і пры велізарнай дапамозе рускага рабочага класа, і якіх мы будзем біць, калі яны яшчэ раз пасягнуць на нашу зямлю, але будзем біць ужо на іх тэрыторыі і біць насмерць.

Подлыя здраднікі — нацыянал-фашысцкія і трацкісцка-бухарынскія бандыты, агенты капіталістычных фашысцкіх разведак марылі адарваць Совецкую Беларусь ад вялікага СССР, марылі зноў закабаліць наш народ, ператварыць нашу радзіму ў бяспраўную калонію замежнага фашызма. Ворагі былі ўскрыты і знішчаны нашай слаўнай совецкай разведкай пад кіраўніцтвам Нікалая Іванавіча Ежова.

Як ніколі згуртаваўся ўвесь совецкі народ вакол сваёй партыі, вакол вялікага любімага Сталіна.

Дарагія таварышы! Працоўныя горада Менска вітаюць вас з прадстаячымі выбарамі Вярхоўных Советаў саюзных рэспублік.

У радасны дзень — 26 чэрвеня беларускі народ разам з усімі народамі Совецкага Саюза яшчэ раз прадэманструе перад усім светам сваё несакрушальнае марально-палітычнае адзінства, сваю беззаветную адданасць справе соцыялізма. Ён пакажа ўсяму свету магутную сілу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Палкае большэвіцкае прывітанне брацкім украінскаму і грузінскаму народам!

Няхай жыве сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве вялікі Сталін!



Тытульны ліст «Слова аб палку Ігараву» работы мастака Палеха — Івана Голікава. Фотарэпрадукцыя Шышко (БСФ).

МІТЫНГ У МЕНСКУ

24 мая радасная, хвалюючая вестка абляцела гарады і калгасныя сёлы ордэнаноснай Совецкай Беларусі: любімы друг і настаўнік народаў Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін**, яго верныя і бліжэйшыя саратнікі Вячаслаў Міхайлавіч **Молатаў**, Клімент Ефрэмавіч **Варашылаў** і Нікалай Іванавіч **Ежоў** далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Гэты сонечны майскі дзень стаў днём усенароднага лікавання. Вялікую радасць і ўдзячнасць выказаў на шматтысячных мітынгах беларускі народ вялікаму Сталіну, кіраўнікам партыі і ўрада — сваім першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

150 тысяч працоўных гор. Менска—рабочыя і работніцы, інтэлігенцыя і студэнты, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі сабраліся на агульнагарадскі мітынг.

Мітынг адкрыў в. а. сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Волкаў**. Аб шчасці і радасці народаў Совецкай Беларусі, атрымаўшых вялікі гонар абраць першым дэпутатам соцыялістычнага парламента сваёй ордэнаноснай рэспублікі вялікага Сталіна, аб любві і ўдзячнасці беларускага народа вялікаму Сталіну за сонечнае, шчаслівае жыццё гаварыў тав. Волкаў ва ўступнай прамове.

Магутнае, велічнае «ура» у гонар вялікага правадыра доўга не змаўкае над плошчай.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР тав. **Абушэнка** зачытвае рашэнні акруговых выбарчых камісій аб рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава і Ежова.

Слова атрымоўвае стаханавец завода імя Варашылава тав. **Лоскат** — прадстаўнік выбаршчыкаў Прамысловай выбарчай акругі гор. Менска, дзе будзе балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Простыя, сардэчныя словы старога рабочага-ліцейшчыка выражаюць агульную радасць і гордасць працоўных Менска.

— Перажываемы намі сёнешні гістарычны дзень поўны радасці і шчасця. Гэта гістарычная падзея ўвойдзе ў гісторыю Беларусі як самая радасная, самая светлая старонка ў жыцці беларускага народа, — гаворыць тав. Лоскат. — Наш любімы правадыр таварыш Сталін і бліжэйшыя, верныя яго саратнікі — лепшыя з лепшых сыноў і кіраўнікоў совецкага народа — таварышы Молатаў, Варашылаў і Ежоў аказалі нам найвялікшае давер'е і гонар...

Авацыі і «ура» ў гонар таварыша Сталіна і яго баявых саратнікаў з новай сілай грымяць над плошчай.

Гарачую, ад сэрца шчырую прамову гаворыць прафесар Дзяржаўнага медыцынскага інстытута тав. **Голуб**— прадстаўнік выбаршчыкаў Дзяржынскай выбарчай акругі гор. Менска, дзе будзе балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР глава совецкага ўрада Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў.

Пра шчасце жыцця совецкага народа і сонечны соцыялістычны росквіт Совецкай Беларусі, пра росквіт нашай соцыялістычнай культуры гаворыць прамоўца і заклікае аднадушна аддаць галасы:

— За вялікага Сталіна, увасабляючага сабой надзею і гордасць усяго працоўнага і прагрэсіўнага чалавецтва;

За лепшага саратніка і друга вялікага Сталіна, главу совецкага ўрада Вячаслава Міхайлавіча Молатава;

За жалезнага наркома абароны, першага маршала Совецкага Саюза тав. Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

За вернага вартавога найвялікшых перамог соцыялізма, крыштальна чэснага, любімага сына совецкага народа, баявога кіраўніка непераможнай совецкай разведкі тав. Нікалая Іванавіча Ежова.

Вучонага ля мікрафона на трыбуне змяняе стаханаўка завода ланцугоў Галя тав. **Цыпорына** — прадстаўнік выбаршчыкаў Молатаўскай выбарчай акругі, дзе ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР будзе балатыравацца маршал Совецкага Саюза Клімент Ефрэмавіч Варашылаў.

Аб магутнасці нашай радзімы і згуртаванасці совецкага народа вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна гаворыць тав. Цыпорына.

— Нікому і ніколі не ўдасца разарваць братнюю дружбу народаў СССР. Усе спробы ворагаў соцыялізма, прэзрэнных агентаў фашызма разаб'юцца аб несакрушальную магутнасць соцыялістычнай радзімы. Лікуючы беларускі народ бясконца шчаслівы тым, што першым дэпутатам Вярхоўнага Совета будзе той, хто прынёс народам Беларусі шчаслівае і радаснае жыццё, хто даў нам магчымасць стаць роўнымі ў вялікай сям'і народаў шчаслівай краіны соцыялізма, хто разам з вялікім Леніным даў дзяржаўнасць Беларусі, хто вядзе нас да далейшых перамог комунізма — лепшы друг беларускага народа Іосіф Вісарыёнавіч Сталін...

Выступае баец Н-скай часці тав. **Дзмітрыеў**. Аб шчаслівым жыцці беларускага народа і непрыступнасці свяшчэнных совецкіх граніц, адзінстве нашай арміі з нашым народам гаворыць ён.

— БССР — баявы фарпост Совецкага саюза на заходніх граніцах. Мы ні на мінуту не забываем пра гэта,— адзначае тав. Дзмітрыеў — Чырвоная Армія, вырашчаная нашай партыяй і мудрым правадыром таварышам Сталіным, узначальваемая лепшым палкаводцам РСЧА, першым маршалам Совецкага Саюза тав. Варашылавым, з'яўляецца грозой для ўсіх ворагаў. Чырвоная Армія неадлучна ад народа, што складае яе несакрушальную сілу.

Апошнія словы прамоўцы, прысвечаныя вялікаму Сталіну і яго верным саратнікам, тонуць у магутных хвалях авацый і «ура»... Загучаў велічны гімн — «Інтэрнацыянал».

Аднадушна, з вялікім уздымам выбаршчыкі Менска прынялі на мітынгу прывітальныя тэлеграмы таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву і Ежову. Аднадушна прынята прывітанне народам братніх рэспублік—Грузінскай ССР і Украінскай ССР. Аднадушна прыняты зварот да ўсіх працоўных ордэнаноснай Беларускай ССР аб арганізаваным правядзенні выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Працоўныя Менска на сваім 150-тысячным мітынгу выказалі сваю бязмежную любоў і адданасць правадыру і другу — роднаму Сталіну, прадэманстравалі згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, гатоўнасць аднадушна аддаць свае галасы ў дзень выбараў — 26 чэрвеня — выпрабаваным і загартаваным большэвікам, лепшым сынам народа —кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных.

ВЫПРАЎЛЕННЕ ПАМЫЛКІ

У нашай газеце ад 22 лістапада 1937 года ў артыкуле тт. А. Есакова і В. Белкіна «Злачынныя справы ў Тэатры оперы і балета» тав. Ярыкаў абвінавачваўся ў сувязях з ворагам народа. Гэта абвінавачванне пры праверцы не пацвердзілася. Гэтым рэдакцыя выпраўляе сваю памылку.

Праф. Н. Гудзій

„СЛОВА АБ ПАЛКУ ІГАРАВУ"—ГЕНІЯЛЬНЫ ТВОР НАШАГА ГЕРАІЧНАГА ЭПАСУ

У 1185 годзе ноўгарад-северскі князь Ігор Святаслававіч у саюзе са сваім братам Усеваладам, сынам Уладзімірам і пляменнікам Святаславам прадпрыняў паход на стэповы вандроўніцкі народ—палаўцаў, якія сваімі набегамі спусташалі і руйнавалі паўднёвыя рускія вобласці, зганялі ў палон рускіх людзей. Паход гэты, у якім Ігар і яго саюзнікі пацярпелі цяжкае паражэнне, паслужыў тэмай для геніяльнага твора рускага гераічнага эпасу—«Слова аб палку Ігараву». Яно ў большай сваёй частцы было напісана хутка-ж пасля выклікаўшай яго падзеі і закончана, трэба думаць, гады праз два-тры пасля паходу. Адкрыта было «Слова» ў адным яраслаўскім манастыры ў 1795 годзе любіцелем і збіральнікам старажытнасцей А. І. Мусіным-Пушкіным і ім-жа ў супрацоўніцтве з двума вучонымі спецыялістамі надрукавана ў Маскве ў 1800 годзе. У 1812 годзе у часе маскоўскага пажару пры нашэсці французаў, адзіны дайшоўшы да нас спісак каштоўнага помніка загінуў.

Прыступаючы да свайго твора, аўтар сам сабе задае пытанне, як яго пачаць—ці так, як спяваў некалі на славу князёў невядомы нам песняр Баян, які жыў, відаць, за некалькі дзесяцігоддзяў да нашага аўтара, ці спяваць яму слогам цяперашніх песень, «па былінах нашага часу». Але тут-жа ён вырашае, што яму не зраўняцца з вешчым Баянам: Баян, калі каго хацеў успець, дык насіўся ваверкай па дрэву, шэрым ваўком па зямлі, шызым арлом пад воблакамі. Такой сілы песеннага дару аўтар «Слова» не адчувае ў сабе, і таму выбірае для сябе другі шлях. Аднак, адмовіўшыся следаваць за Баянам, паэт раз-по-разу ідзе па яго ступах і выяўляе такі-ж буйны палёт паэтычнай фантазіі, як і Баян.

Следам за ўступам у «Слове» гаворыцца аб сонечным зацменні, якое павінна перасцерагчы Ігара ад яго рызыкоўнага намеру, але якім Ігар грэбуе: ён, перапоўнены мужнасці і адвагі, лічыць за лепшае пасці ў баю, чым патрапіць у палон да ворагаў. Насустрач Ігару ідзе яго брат Усевалад са сваёй храбрай дружынай, які шукае сабе чэсці, а князю славы. Прырода злавеснымі прадзнаменнямі суправаджае ўвесь шлях Ігара к Дону, дзе ён павінен сустрэцца з палаўцамі. Першая сустрэча Ігара з непрыяцельскім войскам была, аднак, удалай для Ігара: ён разбіў палаўцаў і захапіў велізарную здабычу. Але следам за тым палаўцы, ачухаўшыся, павялі рашучы наступ на рускія войскі. Тры дні доўжылася другая бітва і закончылася паражэннем рускіх. Ігар, Усевалад, які асабліва мужна адбіваўся ад ворагаў, а таксама сын Ігара—Уладзімір патрапілі ў палон. Паэт прыгадвае на памяць мінулыя бітвы, якія адбываліся з-за княжацкіх спрэчак, але такой кровепралітнай, як гэта, не прыпамінае. Ён параўноўвае яе то з пасевам, то са шлюбным пірам. «Чорная зямля пад капытамі касцьмі была пасеяна, а крывёю паліта; горам узышлоў пасеў па Рускай зямлі», «тут крывавага віна нехапіла; тут скончылі пір храбрыя рускія, сватоў папаілі, а самі палеглі за зямлю Рускую».

Папракнуўшы затым Ігара і Усевалада за тое, што яны сваім неабдуманым і безразважным крокам звялі на нішто мінулагоднюю бліскучую перамогу над палаўцамі кіеўскага князя Святаслава, аўтар расказвае аб змрочным сне Святаслава, сэнс якога талкуюць кіеўскія баяры: паход Ігара скончыўся няшчасцем, і палаўцы рынуліся руйнаваць Рускую зямлю. Выслухаўшы талкаванне свайго сну, Святаслаў гаворыць славутае «залатое слова». У ім ён дакарае Ігара і Усевалада за іх безразважную зацею, якая прынесла столькі гора Рускай зямлі, і заклікае найбольш моцных і паважных рускіх князёў згуртавацца вакол яго, каб адпомсціць ворагам «за зямлю Рускую, за раны Ігаравы, буйнага Святаславіча».

Звярнуўшыся затым успамінамі да полацкіх князёў, якія сваімі раздорамі губілі Рускую зямлю, аўтар перадае плач жонкі Ігара—Яраслаўны, — адзін з самых паэтычных эпізодаў «Слова». Гэты плач-заклінанне сілай укладзенага ў яго кахання ўтварае якбы магічнае дзеянне на лёс Ігара. Пры дапамозе палаўчаніна Оўлура ён уцякае з палону ў Рускую зямлю. Прырода, якая раней наклікала яму бяду, цяпер усямерна садзейнічае яго ўцёкам. Руская зямля радасна сустракае вярнуўшагася Ігара. Заканчваецца «Слова» паведамленнем аб прыбыцці Ігара ў Кіеў і велічаннем князёў і дружын, якія ўдзельнічалі ў палавецкім паходзе.

Аўтар «Слова аб палку Ігараву» быў у вышэйшай ступені паэтычна адораным чалавекам. Ён стаіць у радзе першых нашых паэтаў усіх часоў. Пушкін, які любоўна вывучаў неўміручую паэму незадоўга да сваёй смерці, пярэчыў тым, хто лічыў яе пазнейшай падробкай, якая адносіцца да XVIII стагоддзя, пісаў аб тым, што нашы паэты XVIII стагоддзя «не мелі ўсе разам столькі паэзіі, колькі знаходзіцца яе ў плачы Яраслаўны, у апісанні бітвы і ўцёкаў». Не імкнучыся да дакладнай перадачы падзей паходу і ўцёкаў Ігара з палону, аўтар дае нам рад змяняючых адна другую карцін, гранічна насычаных паэтычнымі вобразамі, багатых яркімі фарбамі. У «Слове» ўсё жыве, рухаецца, гучыць. Прырода, якая прымае тут самы жвавы ўдзел у лёсе рускіх князёў і іх дружыны,—жывая, адухоўленая і дзейсная. Яна ў «Слове» неаддзяліма ад свету чалавека, як чалавек неаддзялім ад свету прыроды. У яе дапамозе і спагадзе—зарука чалавечага дабрабыту і ўдачы, роўна гэтак-жа як у яе варожых адносінах да чалавека крыецца прычына ўсялякіх яго благіх прыгод і бед.

Непараўнаны па свайму хараству вобраз Яраслаўны, якая на сцяне Пуціўля галосіць па сваім палонным мужу і заклінае вецер, Днепр і сонца дапамагчы Ігару вярнуцца на радзіму, — узыходзіць да народных галашэнняў. Народнай песняю падказана аўтару «Слова» параўнанне бітвы з пасевам, пірам і малацьбою, як да народнай творчасці ўзнімаюцца і многія іншыя параўнанні ў паэме аб Ігаравым паходзе і многія яго эпітэты і метафары. Блізкасцю да тагочасных паэтычных поглядаў народа, яшчэ не зжыўшага ў той час язычаства, тлумачыцца і прысутнасць у «Слове» язычаскіх багоў. Закранаючы «Слова» у сваёй перапісцы з Ф. Энгельсам, К. Маркс пісаў: «Уся песня носіць хрысціянска-гераічны характар, хоць язычаскія элементы выступаюць яшчэ вельмі прыкметна». (К. Маркс і Ф. Энгельс, Творы, т. XXII, стар. 122).

Аднак, аўтар «Слова аб палку Ігараву» не толькі быў глыбока прасякнуты народна-паэтычнай стыхіяй, але вельмі добра ведаў і пісьмовую літаратуру свайго часу, арыгінальную і перакладную.

Аўтар «Слова», апрача таго, надзвычай добра ведаў мінулае і сучаснае Рускай зямлі. Ён вельмі добра разбіраецца ў падзеях рускай гісторыі і ў паміж княжацкіх адносінах.

Русь канца XII стагоддзя, калі пісалася «Слова аб палку Ігараву», знаходзілася ў стане феадальнай раздробленасці. Рускія князі сваімі частымі раздорамі знясілялі адзін другога, а ворагі, карыстаючыся гэтым, прыходзілі на Рускую зямлю і спустошалі яе. Бывала і так, што ў спрэчках адзін з другім князі выкарыстоўвалі дапамогу ворагаў, у прыватнасці палаўцаў. Найбольш палітычна далёкавідушчыя, рускія людзі разумелі гібельнасць для Русі княжацкіх міжусобіц і прапагандыравалі ідэю аб'яднання ўсіх рускіх сіл на барацьбу з варожымі нашэсцямі. Энергічна выказваўся за гэту ідэю і старарускі летапісец. Але з асаблівай страснасцю і пераканаўчасцю рабіў гэта аўтар «Слова аб палку Ігараву». У цытаваным вышэй пісьме да Энгельса Маркс пісаў аб «Слове» «Сэнс паэмы—закліканне рускіх князёў да аб'яднання якраз перад нашэсцем манголаў». (Там-жа, стар. 122).

Сапраўды, іменна ў закліканні рускіх князёў да спынення ўзаемных спрэчак, да аб'яднання іх перад тварам варожай пагрозы — асноўны сэнс «Слова». Нядобрай памяццю напамінае аўтар дзеда Ігара і Усевалада—Олега Гарыславіча, які «мечам крамолу каваў і стрэлы на зямлі сеяў». Пры ім у княжацкіх спрэчках укарачалася жыццё чалавечае. У той час рэдка аратыя пераклікаліся, але часта груганы крумкалі, дзелячы паміж сабой трупы рускіх воінаў. З горкім дакорам звяртаецца паэт і да ўнукаў полацкага князя Усевалада, якія паставілі сабе як-бы самамэтай безразважныя вайсковыя авантуры: «Ужо схіліце сцягі свае, укладзіце ў ножны свае мечы пашкоджаныя: ужо выскачылі вы з дзедаўскай славы. Вы-ж бо сваімі крамоламі пачалі наводзіць паганых на зямлю Рускую, на набыткі Усеслававы; з-за раздораў-жа пайшоў гвалт ад зямлі Палавецкай». Яму шкада, што нельга было навекі ўтрымаць ля Кіеўскіх гор аберагальніка граніц Рускай зямлі Уладзіміра Манаха, які быў грозой для палаўцаў, і што цяпер сцягі Манамахавы падзялілі між сабой рускія князі. Заклік паўстаць за зямлю Рускую найбольш энергічна гучыць у звароце да князёў кіеўскага князя Святаслава, у яго «залатым слове», сапраўды залатым па сваёй мастацкай сіле і па сваёй паэтычнай значнасці.

Святкуючы юбілей найвялікшага помніка нашага гераічнага эпасу, мы робім гэта таму, што ён, гэты помнік, у геніяльнай паэтычнай форме ўвасобіў у сабе вышыню нашай старой культуры і сілу палітычнай і нацыянальнай самасвядомасці рускага народа ў першыя стагоддзі яго гістарычнага жыцця. «Слова аб палку Ігараву» узнікла ў той агульнай калысцы, якой была Кіеўская Русь для велікарусаў, украінцаў і беларусаў. Яно па-праву належыць у роўнай меры ўсім гэтым тром братнім народам. Яно, і не толькі яно адно, а і многія іншыя помнікі нашай старой культуры—літаратурны, жывапісны, архітэктурны — лепшы, зусім бясспрэчны матэрыял для абвяржэння заведамага фашысцкага паклёпу на рускае гістарычнае мінулае, як такое, якое пазбаўлена вялікіх культурных традыцый.

Нам, совецкім людзям, адстайваючым у варожым нам абкружэнні свабоднае, творча развіваючаеся жыццё нашай радзімы, яе дабрабыт і працвітанне, асабліва зразумелы і асабліва дарагі той патрыятычны ўздым, з якім аўтар «Слова» кліча на абарону роднай зямлі ад пасяганняў на яе яе ворагаў.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела Г—4674.